ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2020 № 205

# Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Краязнаўства» для VI–IX класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Краязнаўства» (далей – вучэбная праграма) прызначана для VI–IX класаў ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 35 гадзін (1 гадзіна на тыдзень).

У Канцэпцыі бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі адным з асноўных напрамкаў выхавання вызначана фарміраванне грамадзянскасці і патрыятызму асобы. У аснове гэтага працэсу ляжаць засваенне агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцей, культурных і духоўных традыцый беларускага народа, фарміраванне гатоўнасці да выхавання грамадзянскага абавязку.

Важнейшым сродкам далучэння навучэнцаў да грамадзянскай культуры з’яўляецца краязнаўчая дзейнасць. Школьнае краязнаўства – гэта педагагічны працэс арганізацыі дзейнасці навучэнцаў, які звязаны з вывучэннем імі роднага краю і выкарыстаннем атрыманых ведаў на практыцы. У працэсе краязнаўчай дзейнасці ў дзяцей назапашваецца вопыт узаемадзеяння з прыродным і сацыяльным навакольным асяроддзем. Пад «краязнаўчай дзейнасцю» вучняў разумеецца не толькі пошукавая, але і любая дзейнасць пры ўмове асэнсавання яе сувязі з пазнаннем, зберажэннем і забеспячэннем развіцця свайго краю. Школьнае краязнаўства мае шэраг напрамкаў, якія адрозніваюцца па аб’екце і прадмеце вывучэння. Суадносна з асноўнымі аб’ектамі вывучэння вылучаюць

экалагічнае, эканамічнае, геаграфічнае, гістарычнае, літаратурнае, мастацвазнаўчае, а таксама комплекснае краязнаўства, якое сінтэзуе ўсе названыя напрамкі.

Дадзеная вучэбная праграма арыентавана менавіта на комплекснае краязнаўства. У аснову зместу факультатыўных заняткаў «Краязнаўства» пакладзены комплексны падыход, які ўлічвае як розныя бакі пазнання роднага краю, так і розныя аспекты выхавання вучняў у працэсе краязнаўчай дзейнасці.

3. Мэта – фарміраванне ў навучэнцаў ведаў аб родным краі ў агульнадзяржаўным і сусветным кантэксце; выхаванне грамадскасці і патрыятызму як вызначаючых якасцей асобы.

4. Задачы:

абуджэнне цікавасці да роднага краю і паглыбленне ведаў аб ім;

фарміраванне каштоўнасных адносін да матэрыяльнай, культурнай і прыроднай спадчыны народа Беларусі;

выхаванне нацыянальнай самасвядомасці і ўмення жыць ў полікультурным асяроддзі;

фарміраванне пошукавых уменняў;

абуджэнне ў навучэнцаў імкнення да самаўдасканалення.

Для дасягнення азначанай мэты і выканання пастаўленых задач выкарыстоўваюцца наступныя формы і метады арганізацыі вучнёўскай дзейнасці: лекцыі, падрыхтоўка рэфератаў, складанне радаводаў, летапісаў устаноў адукацыі, запіс успамінаў, работа ў архівах, бібліятэках, прэзентацыі, сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, прадстаўнікамі розных прафесій і іншае.

Дадзеная вучэбная праграма арыентавана на вучняў VI–IX класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і абапіраецца на такія асноўныя школьныя дысцыпліны, як геаграфія і гісторыя Беларусі, батаніка, заалогія, беларуская літаратура. Яна разлічана на два гады і прадугледжвае паслядоўнае пашырэнне ведаў, уменняў і навыкаў, засвоеных навучэнцамі на ўроках, а таксама атрыманне новых ведаў. Там, дзе ў прыкладным тэматычным плане пры вывучэнні тэмы адводзіцца па адной гадзіне на тэорыю і практыку, трэба разумець, што гэты занятак камбінаваны і спалучае як вывучэнне тэорыі, так і практычную работу.

5. Асноўнымі напрамкамі работы з’яўляюцца тэарэтычная падрыхтоўка, практычныя заняткі, самастойная работа, экскурсіі.

Тэарэтычная падрыхтоўка ўяўляе сабой лекцыі настаўнікаў, якія вядуць факультатыўныя заняткі «Краязнаўства», і самастойную працу вучняў над рэкамендаванай літаратурай. На асобныя заняткі пажадана запрашаць навукоўцаў, супрацоўнікаў музеяў, пісьменнікаў, музыкантаў, спецыялістаў той ці іншай галіны. Навучэнцы могуць дапамагаць даследчыкам у распрацоўцы некаторых пытанняў.

Адной з найбольш эфектыўных формаў работы з’яўляецца семінар. Рыхтуючыся да семінарскіх заняткаў, вучні праводзяць пошук, збіраюць матэрыялы, аналізуюць, сістэматызуюць і абагульняюць іх, робяць вывады. Больш падрыхтаваным вучням можна прапанаваць напісаць даклады, рэфераты, астатнія распрацоўваюць асобныя пытанні і выступаюць у якасці судакладчыкаў і апанентаў.

На практычных занятках навучэнцы знаёмяцца з прыёмамі работы з літаратурай, дакументамі, фатаграфіямі, апрацоўваюць сабраны матэрыял.

Дадзеная вучэбная праграма ўяўляе сабой інварыянт, прапанаваную тэматыку заняткаў можна ўдакладняць у залежнасці ад рэгіёна, мясцовасці, узроўню падрыхтаванасці вучняў. Вывучэнне зместу факультатыўных заняткаў «Краязнаўства» адбываецца праз зварот да гісторыі, прыроды, культуры, сацыяльнага асяроддзя роднага краю, сваёй установы адукацыі, сям’і.

Па магчымасці пажадана зацікавіць і далучыць бацькоў да дзіцячай краязнаўчай дзейнасці, запрашаючы іх у сумесныя паходы і экскурсіі, на заняткі і прапануючы ім азнаямленне з метадычнай літаратурай.

6. У выніку засваення дадзенай вучэбнай праграмы вучні павінны ведаць:

асноўныя прыродныя, гісторыка-культурныя і іншыя падзеі і аб’екты свайго краю ў агульнадзяржаўным і сусветным кантэксце;

асаблівасці гаспадарчай, сельскагаспадарчай, творчай, спартыўнай і іншай дзейнасці сваіх землякоў;

асноўныя прафесіі, запатрабаваныя ў сваёй мясцовасці, рэгіёне;

знакамітых землякоў;

гісторыю сваёй установы адукацыі, сям'і;

авалодаць навыкамі і ўменнямі:

працы з літаратурнымі і архіўнымі крыніцамі;

складання тэкставага апісання геаграфічнага становішча сваёй мясцовасці, вызначэння асноўных формаў мясцовага рэльефу і іншае;

вядзення календара надвор'я і феналагічных назіранняў;

устанаўлення з дапамогай адпаведных вызначальнікаў назваў раслін, жывёл сваёй мясцовасці;

складання фотагербарыяў;

пошукавай дзейнасці;

апрацоўкі пісьмаў, фатаграфій, успамінаў;

складання радавода, летапісу ўстановы адукацыі;

запісу і апрацоўкі гутарак з ветэранамі, прадстаўнікамі прадпрыемства, мясцовымі жыхарамі;

працы асобна, у парах, у групах.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН
### Першы год навучання

| № п/п | Тэма | Колькасць гадзін (усяго) | З іх | |
|---|---|---|---|---|
| | | | тэарэт. | практ. |
| 1 | Уводзіны | 2 | 1 | 1 |
| 2 | Геаграфічнае становішча роднага краю | 2 | 1 | 1 |
| 3 | Карысныя выкапні | 1 | 1 | – |
| 4 | Рэльеф | 3 | 1 | 2 |
| 5 | Клімат і надвор'е | 4 | 2 | 2 |
| 6 | Унутраныя воды | 4 | 3 | 1 |
| 7 | Глебы | 4 | 2 | 2 |
| 8 | Вывучэнне расліннасці | 6 | 3 | 3 |
| 9 | Жывёльны свет | 5 | 2 | 3 |
| 10 | Ахова і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў | 3 | 1 | 2 |
| 11 | Абагульняючы занятак | 1 | | 1 |
| | УСЯГО | 35 | 17 | 18 |

1. Тэма «Уводзіны» (2 гадзіны)

Мэты і задачы, знаёмства з планам работы і яго абмеркаванне. Знакамітыя краязнаўцы сваёй мясцовасці. Наведванне школьнага краязнаўчага музея.

2. Тэма «Геаграфічнае становішча роднага краю» (2 гадзіны)

Наш край (пасёлак, горад, раён, вобласць) на карце рэспублікі, Еўропы. Межы і памеры роднага краю. Геаграфічныя каардынаты, прыродная зона. Адлегласць ад характэрных фізіка-геаграфічных пунктаў (экватара, полюса, палярнага круга, мора), гаспадарчых і культурных аб'ектаў (прамысловых цэнтраў, чыгуначных станцый, запаведнікаў, заказнікаў і іншае).

Практычныя работы. Складанне тэкставага апісання геаграфічнага становішча сваёй мясцовасці.

3. Тэма «Карысныя выкапні» (1 гадзіна)

Карысныя выкапні сваёй мясцовасці, асаблівасці іх выкарыстання.

4. Тэма «Рэльеф» (3 гадзіны)

Рэльеф як асобны кампанент прыродна-тэрытарыяльнага комплексу ландшафту, яго ўплыў на фарміраванне глебы, гідраграфічную сетку (рэкі, азёры, балоты), размеркаванне расліннасці, клімат і мікраклімат.

Сучасны рэльеф Беларусі і асаблівасці яго ўтварэння. Максімальныя і мінімальныя вышыні Беларусі. Асноўныя формы рэльефу сваёй мясцовасці (узгорак, яр, пойма ракі, катлавіна, раўніна), іх характарыстыка, асаблівасці ўтварэння. Асаблівасці змянення рэльефу пад уздзеяннем прыродных фактараў і гаспадарчай дзейнасці чалавека.

Экскурсія на ўзгорак, у рачную даліну. Выдзяленне асноўных элементаў дадзеных формаў рэльефу.

Практычныя работы. Апісанне мясцовых формаў рэльефу, вызначэнне з дапамогай самаробнага нівеліра, экліметра і іншых інструментаў іх адноснай вышыні, стромкасці схілаў, шырыні, даўжыні і іншае. Замалёўка ці фатаграфаванне асобных формаў рэльефу для школьнага краязнаўчага музея ці краязнаўчага гуртка.

5. Тэма «Клімат і надвор’е» (4 гадзіны)

Надвор’е, асаблівасці яго фарміравання. Асноўныя тыпы надвор’я сваёй мясцовасці. Арганізацыя назіранняў за надвор’ем (тэмпература, воблачнасць, вецер, ападкі, атмасферны ціск, вільготнасць паветра) і працай людзей. Феналагічныя назіранні. Сезонныя змены ў прыродзе сваёй мясцовасці. Прагноз надвор’я. Надвор’е і гаспадарчая дзейнасць чалавека. Забруджванне атмасфернага паветра пад уплывам тэхнагенных фактараў.

Клімат як шматгадовы рэжым надвор’я. Асноўныя фактары і асаблівасці фарміравання клімату сваёй мясцовасці, яго тыпы.

Экскурсія на метэастанцыю, пункт кантролю за станам атмасфернага паветра раёна.

Практычныя работы. Знаёмства з прыборамі для правядзення метэаралагічных назіранняў. Вядзенне календара надвор’я і феналагічных назіранняў. Збор матэрыялаў пра забруджванне паветра мясцовымі прадпрыемствамі.

6. Тэма «Унутраныя воды» (4 гадзіны)

Вада і яе ўласцівасці. Роля вады ў жыцці чалавека і прыродзе. Рэкі, азёры, вадасховішчы, сажалкі сваёй мясцовасці, падземныя воды. Рака, рачная сістэма і рачны басейн. Воднае жыўленне і водны рэжым ракі, яго асаблівасці. Гаспадарчае выкарыстанне ракі. Экалагічны стан ракі і мерапрыемствы па яго паляпшэнні.

Азёры, іх паходжанне. Воднае харчаванне і водны рэжым возера. Жывёльны свет. Гаспадарчае выкарыстанне. Уплыў гаспадарчай дзейнасці на экалагічны стан возера.

Падземныя воды, іх якасць, асноўныя мерапрыемствы па ахове і рацыянальным выкарыстанні падземных водаў.

Экскурсія на раку, возера, да крыніцы.

Практычныя работы. Гідралагічнае апісанне ракі, кароткае апісанне яе басейна (выток, вусце, даліна, пойма, русла ракі, звілістасць русла). Вызначэнне рэжыму ракі, яе экалагічнага стану.

Вывучэнне возера, яго паходжання. Прыродная характарыстыка возера (рэльеф, вадазборы, расліннасць, забалочанасць), памер і канфігурацыя, упадаючыя і выцякаючыя рэкі, характар берагоў, наяўнасць астравоў. Даўжыня і шырыня, глыбіня. Рэжым узроўняў вады, лядовы рэжым. Донная расліннасць, відавы састаў рыб. Экалогія возера, яго гаспадарчае значэнне.

7. Тэма «Глебы» (4 гадзіны)

Глеба як асобнае цела прыроды, асаблівасці ўтварэння глебы. Асноўныя тыпы глеб, адрозненне між імі. Уплыў глеб на асаблівасці гаспадарчага выкарыстання. Эрозія глеб і мерапрыемствы па барацьбе з ёю. Забруджванне глеб і шляхі павышэння іх урадлівасці, меліярацыя глебы, экалагічныя праблемы, што ўзнікаюць у выніку меліярацыі.

Экскурсія на бліжэйшае сельскагаспадарчае поле, гутарка з аграномам аб асаблівасцях глебы сваёй мясцовасці.

Практычныя работы. Закладка ў полі на розных элементах рэльефу (вяршыня, схіл, падножжа ўзгорка) глебавых разрэзаў, выдзяленне глебавых гарызонтаў, апісанне іх марфалагічных прыкмет. Вызначэнне назвы глебы. Складанне клееных глебавых маналітаў (мікраманалітаў) для школьнага краязнаўчага музея.

Вывучэнне калгаснай глебавай карты. Выпрацоўка мерапрыемстваў па павышэнні ўрадлівасці глебы прышкольнага даследчага ўчастка.

8. Тэма «Вывучэнне расліннасці» (6 гадзін)

Асаблівасці размеркавання лясной, лугавой, балотнай расліннасці сваёй мясцовасці. Лес, асноўныя пароды лесу, іх экалагічны стан. Асаблівасці гаспадарчага выкарыстання драўніны. Іншыя багацці лесу: грыбы, ягады, арэхі і іншае. Аздараўленчая і санітарна-гігіенічная роля лесу. Асноўныя мерапрыемствы па ахове лясоў у рэспубліцы, сваёй мясцовасці. Луг, тыпы лугоў. Асноўныя віды лугавой расліннасці, асаблівасці іх гаспадарчага выкарыстання.

Культурная расліннасць сваёй мясцовасці. Асноўныя харчовыя, тэхнічныя, кармавыя, лекавыя, дэкаратыўныя віды расліннасці.

Мерапрыемствы па ахове расліннасці краю. Запаведнікі, заказнікі. Асобныя расліны – помнікі прыроды. Расліны, занесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

Экскурсіі ў лес, на луг па вывучэнні відавога складу расліннасці. Экскурсіі ў батанічны сад, эколага-біялагічны цэнтр.

Практычныя работы. Устанаўленне з дапамогай адпаведнага вызначальніка назвы раслін сваёй мясцовасці. Складанне фотагербарыя. Састаўленне карты лекавых раслін сваёй мясцовасці. Вырошчванне некаторых лекавых раслін на прышкольным участку. Вывучэнне памяткі збору і нарыхтоўкі лекавых раслін.

Знаёмства з работай «зялёнага патруля». Высвятленне мясцовых народных традыцый па ахове расліннасці.

9. Тэма «Жывёльны свет» (5 гадзін)

Фаўна лясоў, лугоў, балот, сельскагаспадарчых угоддзяў, яе асаблівасці. Роля чалавека ў рассяленні і ахове жывёл. Мерапрыемствы па ахове аб’ектаў жывёльнага свету. Жывёлы, занесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

Экскурсіі з мэтай знаёмства з жывёльным светам лесу, луга; па экалагічнай сцежцы.

Практычныя работы. Вызначэнне асноўных відаў жывёл на тэрыторыі краю, іх фатаграфаванне, замалёўка. Праслухоўванне запісаў птушыных галасоў.

10. Тэма «Ахова і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў» (3 гадзіны)

Нацыянальныя паркі, запаведнікі і заказнікі, іх роля ў арганізацыі аховы прыроды. Помнікі прыроды Беларусі: паркі, часткі каштоўных пасадак, асобныя рэдкія і векавыя дрэвы, геалагічныя агаленні, валуны, мінеральныя крыніцы. Помнікі прыроды сваёй мясцовасці. Сутнасць стратэгіі рацыянальнага прыродакарыстання.

11. Абагульняючы занятак (1 гадзіна)

Арганізацыя выставы лепшых замалёвак і фатаграфій, твораў мастацтва з прыроднага матэрыялу, дакладаў і самастойных работ вучняў.

Гульня-віктарына «Ці ведаеце вы прыроду свайго краю?».

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН
### Другі год навучання

| № п/п | Тэма | Колькасць гадзін (усяго) | З іх | |
|---|---|---|---|---|
| | | | тэарэт. | практ. |
| 1 | Насельніцтва краю | 4 | 2 | 2 |
| 2 | Тапанімічныя асаблівасці | 4 | 2 | 2 |
| 3 | Асаблівасці забудовы населеных пунктаў | 3 | 1 | 2 |
| 4 | Мінулае нашага краю | 4 | 2 | 2 |
| 5 | Наш край у гады Вялікай Айчыннай вайны | 4 | 2 | 2 |
| 6 | Працоўныя будні краю | 4 | 2 | 2 |
| 7 | Вывучэнне і апісанне прамысловага прадпрыемства | 3 | 1 | 2 |
| 8 | Вывучэнне і апісанне сельскагаспадарчага прадпрыемства | 3 | 1 | 2 |
| 9 | Культура, літаратура і мастацтва краю | 4 | 2 | 2 |
| 10 | Спартыўныя дасягненні землякоў | 1 | 1 | - |
| 11 | Падвядзенне вынікаў работы | 1 | | 1 |
| | УСЯГО | 35 | 16 | 19 |

1. Тэма «Насельніцтва краю» (4 гадзіны)

Сучасныя дэмаграфічныя праблемы Беларусі. Колькасць і нацыянальны склад насельніцтва, асаблівасці быту, абрадаў, аддзення розных нацыянальнасцей краіны і сваёй мясцовасці. Узаемнае ўзбагачэнне культур розных народаў. Песні, танцы, народная музычная творчасць, вусная народная творчасць (прымаўкі, прыказкі і іншае). Народны каляндар. Найбольш распаўсюджаныя прозвішчы ў населеным пункце, іх тапаніміка. Знакамітыя землякі.

Экскурсіі ў этнаграфічны ці краязнаўчы музей, майстэрні мясцовых мастакоў, народных майстроў.

Практычныя работы. Вывучэнне свайго прозвішча; складанне свайго радавода. Збор этнаграфічнага матэрыялу і апісанне прылад працы, адзення, посуду і іншае. Запіс вуснай народнай творчасці людзей розных нацыянальнасцей. Падрыхтоўка і правядзенне аднаго са святаў народнага календара.

2. Тэма «Тапанімічныя асаблівасці» (4 гадзіны)

Асаблівасці тапанімікі населеных пунктаў. Паданні аб паходжанні назваў населеных пунктаў. Знаёмства з літаратурнымі крыніцамі па тапаніміцы Беларусі. Аналіз мясцовых тапонімаў і ўзнаўленне на яго аснове першапачатковага характару таго ці іншага населенага пункта, асаблівасцей фарміравання, планіроўкі, гістарычнай ролі, працэсаў міграцыі народаў ці этнічных груп.

Практычныя работы. Складанне тапанімічнай картатэкі назваў населеных пунктаў сваёй мясцовасці, іх вуліц.

3. «Асаблівасці забудовы населеных пунктаў» (3 гадзіны)

Тыпы населеных пунктаў сваёй мясцовасці, іх форма, планіроўка. Умовы, якія вызначылі месца размяшчэння населеных пунктаў (асаблівасці рэльефу, наяўнасць водных крыніц, характар шляхоў зносін і іншае). Час узнікнення населеных пунктаў. Асаблівасці забудовы жылля людзей, яго план, выкарыстанне кожнай часткі жылля. Спосабы ўпрыгожвання жылля, тэндэнцыя яго змяненняў. Помнікі архітэктуры свайго краю. Археалагічныя помнікі наваколля (горада, раёна, вёскі).

Экскурсіі па населеным пункце, да помнікаў архітэктуры, у музей выяўленчага мастацтва.

Практычныя работы. Збор рэпрадукцый старажытных гравюр, карцін, паштовак з адлюстраваннем асобных вёсак, дамоў. Апісанне помнікаў архітэктуры, фатаграфаванне забудоў рознага часу, знаёмства з мясцовымі археалагічнымі помнікамі.

4. Тэма «Мінулае нашага краю» (4 гадзіны)

Знаёмства з літаратурай па гісторыі краю. Важнейшыя гістарычныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі краю. Знакамітыя землякі. Асаблівасці арганізацыі пошукавай працы.

Экскурсіі па родным краі, сустрэчы са старажыламі.

Практычныя работы. Запіс і абагульненне гутарак са старажыламі.

5. Тэма «Наш край у гады Вялікай Айчыннай вайны» (4 гадзіны)

Знаёмства з літаратурай аб падзеях, якія адбываліся ў ваенныя гады ў краі. Партызанская барацьба мясцовага насельніцтва з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Знакамітыя землякі – удзельнікі падзей Вялікай Айчыннай вайны. Землякі-сучаснікі – героі Беларусі.

Экскурсіі і паходы па месцах баёў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, партызанскіх мясцінах. Экскурсія ў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску, на лінію Сталіна і іншае.

Практычныя работы. Работа з архіўным матэрыялам, аналіз мемуарнай літаратуры. Гутаркі з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны і іх апрацоўка. Апрацоўка франтавых пісьмаў, фатаграфій, успамінаў.

6. Тэма «Працоўныя будні краю» (4 гадзіны)

Сучасны стан народнай гаспадаркі, яе праблемы. Важнейшыя прамысловыя прадпрыемствы і іх прадукцыя. Асноўныя прафесіі на прадпрыемствах. Знакамітыя людзі

працы сваёй мясцовасці. Сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, іх спецыялізацыя. Лепшыя жывёлаводы, паляводы, садаводы, механізатары, фермеры. Ветэраны працы.

Экскурсіі на прамысловыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, сустрэчы і гутаркі з лепшымі людзьмі-працаўнікамі.

Практычныя работы. Запіс і апрацоўка гутарак з ветэранамі працы, передавікамі вытворчасці, фермерамі. Складанне фотаальбома «Імі ганарацца землякі».

7. Тэма «Вывучэнне і апісанне прамысловага прадпрыемства» (3 гадзіны)

Прамысловасць краю, яе месца ў структуры гаспадаркі краіны. Найбольш буйныя прадпрыемствы. Дэталёвае знаёмства з адным з прамысловых прадпрыемстваў і яго апісанне па наступным плане: а) назва прадпрыемства; б) эканоміка-геаграфічная ацэнка становішча прадпрыемства ў адносінах да транспартных шляхоў, сыравіннай і паліўна-энергетычнай базы; в) спецыялізацыя прадпрыемства; г) рабочыя кадры прадпрыемства (колькасны склад, адукацыйны і прафесійны ўзроўні); д) тэхналагічны працэс і прадукцыя, якую выпускае прадпрыемства; е) вытворчыя сувязі прадпрыемства па забеспячэнні сыравінай, палівам, паўфабрыкатамі, збыце гатовай прадукцыі; ж) дынаміка росту выпуску прамысловай прадукцыі і фактары, якія яе абумоўліваюць; рэнтабельнасць, сабекошт прадукцыі; з) перспектывы развіцця прадпрыемства.

Экскурсія на прамысловае прадпрыемства ці ў асобныя яго цэхі, сустрэчы з працаўнікамі, знаёмства з тэхналогіяй вытворчасці.

Практычныя работы. Збіранне ўзораў (фотаздымкаў, замалёвак) прадукцыі аднаго з прадпрыемстваў. Запіс і апрацоўка гутарак з прадстаўнікамі прамысловага прадпрыемства. Знаёмства з асноўнымі прафесіямі.

8. Тэма «Вывучэнне і апісанне сельскагаспадарчага прадпрыемства» (3 гадзіны)

Дэталёвае знаёмства з прадпрыемствам сельскай гаспадаркі і яго апісанне па наступным плане: а) від і назва гаспадаркі, час яе заснавання, змены ў яе складзе з моманту арганізацыі; б) геаграфічнае становішча ў адносінах да суседніх гаспадарак, раённага цэнтра, шляхоў зносін; в) спецыялізацыя гаспадаркі; г) структура зямельнага фонду і якасная ацэнка сельскагаспадарчых угоддзяў; д) характарыстыка асноўных і дапаможных галін сельскай гаспадаркі: паляводства, жывёлагадоўлі, агародніцтва, пчалярства; е) узровень механізацыі гаспадаркі; з) працоўныя рэсурсы, рэнтабельнасць вытворчасці; і) перспектывы развіцця.

Экскурсіі на ферму, зерняток, механізаваны двор і іншае, знаёмства з асаблівасцямі працы, прафесіямі.

Практычныя работы. Запіс і абагульненне гутарак з працаўнікамі гаспадаркі. Выпуск фотаальбома.

9. Тэма «Культура, літаратура і мастацтва краю» (4 гадзіны)

Асаблівасці развіцця культуры, літаратуры і мастацтва на тэрыторыі краю. Знакамітыя вучоныя, артысты, мастакі, паэты і пісьменнікі – ураджэнцы краю. Вусная народная творчасць. Дамы культуры, музеі, народныя тэатры, самадзейныя мастацкія калектывы; асаблівасці іх дзейнасці.

Экскурсіі ў музеі, ва ўстановы культуры, па мясцінах, апісаных у творах пісьменнікаў ці адлюстраваных мастакамі.

Практычныя работы. Сустрэчы з пісьменнікамі, паэтамі, мастакамі, артыстамі і вучонымі-землякамі. Выпуск фотаальбомаў, відэафільмаў.

10. Тэма «Спартыўныя дасягненні землякоў» (1 гадзіна)

Землякі – вядомыя спартсмены, удзельнікі спартыўных спаборніцтваў розных узроўняў.

Практычная работа. Сустрэча з вядомым спартсменам-земляком (выпускніком установы агульнай сярэдняй адукацыі).

11. Тэма «Падвядзенне вынікаў работы» (1 гадзіна)

Прадстаўленне летапісу школы або гімназіі. Правядзенне краязнаўчай вечарыны, сустрэчы са знакамітымі людзьмі, конкурсу твораў аматараў народнай творчасці, канцэрта (па выбары).

Выстава фотаальбомаў, твораў самадзейных мастакоў.